Казімірская Т.А.

ПАДТЭКСТ ЯК ІМПЛІЦЫТНАЕ ВЫРАЖЭННЕ ДУМКІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ П"ЕС А.МАКАЁНКА)

Тэкст -- гэта складаная структура, у якой адзін сродак /слова, словазлучэнне, сказ/ абумоўліваецца іншым і нясе пэўную інфармацыю. Думкі, пачуцці герояў мастацкага твора аўтары часта не выказваюць адкрыта, непасрэдна словамі. Тады і гавораць пра падтэкст. Падтэкст — думка, пачуццё, не выказаныя непасрэдна, але ўгадваюцца ў мастацкіх дэталях, рэпліках персанажаў, у апісаннях прыроды, абстаноўкі, г.зн. стоеныя пад словамі тэксту. Гэтыя думкі і пачуцці могуць нават знаходзіцца ў супярэчнасці з тым, пра што гаворыць персанаж або расказвае аўтар твора [1].

Упершыню паняцце "падтэкст" пад назвай „другі дыялог" асэнсаваў бельгійскі драматург, паэт, лаўрэат Нобелеўскай прэміі М.Метэрлінк у артыкуле „Трагізм паўсядзеннага жыцця" /1896/, але самім падтэкстам карысталіся і раней, напрыклад, І.Тургенеў. Найбольш выкарыстоўваецца падтэкст у драматургіі і тэатральнай творчасці, асаблівае месца падтэксту надаваў К.Станіслаўскі: „Сэнс творчасці — у падтэксце. Без яго слову няма чаго рабіць на сцэне". [2]

Мастацкасць твора, яго літаратурная каштоўнасць залежаць ад умення, майстэрства аўтара дасканала валодаць словам і ствараць падтэкст. Без падтэксту няма літаратурна-мастацкага твора /літаратурна-мастацкага тэксту/.

Як мовазнаўчая катэгорыя падтэкст — "не выражаны словамі ўнутраны сэнс выказвання, які падразумяваецца па „адсутных", "апушчаных" членах сказа ці намёках". [3]

Даўно даказана, што мова мае два ўзроўні выражэння думкі: эксплiцытны і імпліцытны. Тое, што мае свае ўласнае, непасрэднае слоўнае выражэнне, з"яўляецца эксплiцытным, а тое, што не мае такога слоўнага выражэння, але падразумяваецца пад эксплiцытным, ёсць імпліцытнае. Яно выражаецца і спасцігаецца чытачамі /слухачамі, гледачамі/ на аснове эксплiцытнага, а таксама кантэксту і іншых фактараў.

Імпліцытнае, як і эксплiцытае, таксама мае свае выражэнне, прычым

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іменна моўнае выражэнне, але роўнага плану: непрамое, апасродкаванае. Эксплiцытнае і імпліцытнае — дзве ў пэўным сэнсе супрацьлеглыя формы выражэння думкі. Менавіта даследаванне імпліцытнага /а не эксплiцытнага/ з"яўляецца ўласна навуковым, спецыфічным і цікавым аспектам аналізу мовы.

Даследаванні паказваюць, што імпліцытнае праяўляецца рознымі спосабамі ў самых разнастайных сферах і ўзроўнях мовы.

Даследчыкі /напрыклад, В.Х.Багдасаран [4]/ выдзяляюць некалькі відаў імпліцытнага паводле розных прынцыпаў: па характары, шырыні кантэксту, выдзяляецца імпліцытнае на аснове мікракантэксту, г.зн. кантэксту ў межах выказвання, на аснове макракантэксту, г.зн. кантэксту, у які ўваходзіць моўнае акружэнне пэўнага выказвання да цэлай адзінкі мовы /цэлае пісьмо, даклад, апавяданне, раман і г.д./, і на аснове метакантэксту, г.зн. сітуацыі, у якой выкарыстоўваецца пэўная моўная адзінка.

Імпліцытнае можна дзяліць на ўсвядомленае і неўсвядомленае аўтарам, а ўсвядомленае - на прадугледжанае і непрадугледжанае аўтарам для перадачы інфармацыі.

Розныя вучоныя адзначаюць таксама лінгвістычны і лагічны падыходы да імпліцытнага. Пры лагічным падыходзе галоўнае значэнне мае праўдзівасць заключэння, правільнае яно ці не. Для лінгвіста ж гэта не мае значэння: яму важна, што аўтар выказвання сам робіць пэўны вывад і лічыць яго праўдзівым.

Імпліцытнае мае спецыфічнае значэнне ў функцыянаванні чалавечай мовы, бо імпліцытнае робіць яе больш глыбокай, змястоўнай, сціслай, эканомнай.

Да аналагаў імпліцытнага адносяцца: ідэі, веды, навыкі, густы, увасобленыя ў прадметах, выробленых чалавекам; сапраўдныя замыслы і намеры людзей, якія робяць адно, але тайна імкнуцца да зусім іншага; нелегальнае ў сваіх адносінах да легальнага; увасобленая акцёрам роля, правобраз у сваіх адносінах да вобраза і г.д.

Аналагам імпліцытнага выступае значэнне ў сваіх адносінах да знака, а таксама мастацкая ідэя, адпаведна ўвасобленая ў няслоўных відах мастацтва /у музыцы, у жывапісе і г.д./.

У даследаваннях выдзяляюцца наступныя сферы і спосабы праяўлення імпліцытнага: абрэвіяцыя, скараченне, выражэнне дадатковых думак на аснове лексічнага значэння слова, пераноснае значэнне слова, матэматычная задача, прывядзенне прыкладу, дадзеныя веды ў спалучэнні з іншымі, ужыванне агульных назоўнікаў у адзінкавым сэнсе, займеннік, пытанне, няпоўныя сказы, лагічны націск, энцімема, дыпламатычная мова, мастацкае слова. Кожны з гэтых выпадкаў мае свае сферы праяўлення імпліцытнага.

Абрэвіяцыя і скарачэнне як выпадкі імпліцытнага прымяняюцца пераважна ў пісьмовай мове. Напрыклад, у камедыі „Выбачайце, калі ласка":

Калібераў. Там /у Канстытуцыі/ запісана, што абарона Айчыны —

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР.

Абрэвіятура "СССР" імпліцытна абазначае "Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік", як і сам гэты выраз. Скарачацца могуць не толькі часткі, але нават цэлыя словы. Напрыклад, у сентыментальным фельетоне "Верачка" галоўная гераіня чытае тэлеграму:

Арына Радзівонаўна. Тэлеграма. "...Еду. Сібір..." У дадзеным выпадку імпліцытна падразумяваецца на аснове кантэксту скарочаны прыназоўнік "У" /Сібір/.

У мове твораў ёсць словы, якія сваім лексічным значэннем надаюць сказу побач з асноўным значеннем дадатковае. Да такіх слоў можна аднесці толькі, таксама, акрамя, зноў, першы, дзесяты раз, упершыню, нарэшце, будучы, былы, наадварот, хоць, яшчэ, замест і г.д. Напрыклад, у драме "На досвітку":

Мішэль. Я таксама з Парыжа. Слова "таксама" на аснове кактэксту імпліцытна абазначае: як і Жанна.

У камедыі „Каб людзі не журыліся":

Дзед. Я яшчэ сяк-так, а старая ужо... мерзне. За гэтым сказам імпліцытна існуе думка, што стары мог бы жыць і у старой, халоднай хаце, а старая не можа.

Там жа:

Аксіння. Гэта ж ён /Кавальчук/ наш калгас арганізаваў і першым старшынёй быў.

Словы "першы", "арганізаваў" імпліцытна абазначаюць, што да яго ў весцы не было ні калгаса, ні старшыні.

Калі ў мове /вуснай ці пісьмовай/ ужываюцца словы ў пераносным, метафарычным значэнні, гэта азначае, што гаворыцца адно, а падразумяваецца /імпліцытна існуе/ штосьці іншае. Нават назвы п"ес А.Макаёнка, напрыклад, "На досвітку", "Выбачайце, каяі ласка", "Каб людзі не журыліся", можна разумець як у прамым, так і ў пераносным значэнні, а значыць, за эксплiцытным існуе імпліцытнае.

Пераноснае значанне слова з"яўляецца асновай для метаніміі:

Каравай. ...Каса калгаса не далічылася б чатырнаццаці тысяч. /"Таблетку пад язык"/; гіпербалы:

Дзед Цыбулька. Да-а, цесна будзе ў сяле, калі на плес такая техника пойдзе. На вуліцы цесна. /"Таблетку пад язык"/; алегорыі: напрыклад, вобраз куніцы /дзяўчыны-нявесты/ у сватаўской прамове Буйкевіча /"Лявоніха на арбіце"/ і інш.

Займеннік звычайна замяняе імпліцытна выражаную назву, якая эксплiцыруецца на аснове кантэксту. Напрыклад:

Арына Радзівонаўна. ...і дай бог... каб доля твая абмінула гэта... у абход правяла. /"Верачка"/.

Указальны займеннік "гэта" замяняе назоўнік "адзінота", які эксплiцыруецца з кантэксту.

Праз пытанні можна зразумець не толькі тое, што чалавек хоча

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

ведаць, але і тое, што ён ведае. Веданне, на якім будуецца пытанне, існуе імпліцытна. Напрыклад:

Міліцыянер. .... у вас пражывае хто-небудзь без прапіскі, грамадзянка Арына Радзівонаўна? /"Верачка"/.

З кантэксту вядома, што міліцыянер прыйшоў да бабулі праверыць "сігнал", ці жыве ў яе хто-небудзь "без прапіскі". Значыць, у яго ёсць пэўнае веданне, на аснове якога грунтуецца пытанне. Яму трэба толькі пацвердзіць гэта веданне, таму і ставіцца працытаванае пытанне.

Выконваючы сваю спецыфічную функцыю, лагічна выдзяляць словы, словазлучэнні, сказы. Лагічны націск выступае і як сродак выражэння імпліцытнага. Напрыклад:

Кавальчук. ... чаму ты на мяне віну валіш? Чаму я вінаваты?/ "Каб людзі не журыліся"/.

Выдзяляючы лагічна асабовы займеннік "Я" /"мяне"/, аўтар рэплікі падкрэслівае на снове кантэксту, што не ён адзін, а ўсе калгаснікі вінаватыя ў безгаспадарлівасці.

Самай шырокай сферай праяўлення імпліцытнага, з"яўляецца мастацкае слова. Доказам гэтага можна лічыць як саму п"есу "Таблетку пад язык", так і навелу ў ей "Ява — не сон ...".

Дасціпны жарт, вобразныя выразы, крылатыя выслоўі, прымаўкі, прыказкі, афарызмы, загадкі, эзопава мова — усе гэта выконвае іншасказальную функцыю ў такіх п"есах А.Макаёнка, як "Кашмар", "Пагарэльцы", "Лявоніха на арбіце", "Зацюканы апостал", "Трыбунал" і інш.

Мастацкая ідэя твора, як адзначалася вышэй, павінна быць імпліцытнай. Толькі тады твор можна лічыць сапраўды мастацкім, калі і ён прымушае чытача задумвацца над сэнсам жыцця, разважаць, шукаць адказы на злабадзённыя пытанні. Таму ўсе п"есы А.Макаёнка з"яўляюцца высокаідэйнымі, а гэта значыць высокамастацкімі.

ЛІТАРАТУРА

1. Лазарук М.А., Ленсу А.Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў.- Мн., 1983.- С. 109.
2. Станиславский К. Работа актёра над собой.- М., 1951.- С. 494.
3. Сцяцко П.У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў.- Мн., 1990.- С. 93.
4. Багдасарян В.Х. Проблема имплицитного.- Ереван, 1983.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова